

MARK MILLAR · JOHN ROMITA JR.
HIT-GIRL™
$2.99
ISSUE 3
COMICS .BY
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
Забівашка
№3 (2012)
пераклад
і афармленне:
Козыраў Сяргей
OMG!
ICON®

HIT-GIRL

ISSUE THREE

MARK MILLAR
WRITER AND COCREATOR

JOHN ROMITA JR.
BREAKDOWNS AND COCREATOR

TOM PALMER
FINISHES AND INK WASHES

DEAN WHITE
with MICHAEL KELLEHER
COLORS

CHRIS ELIOPOULOS
LETTERS

JENNIFER LEE
EDITOR

VARIANT COVER
JOCK

PREVIOUSLY:

Kick-Ass is down, Hit-Girl is ready to dazzle the Mean Girls, and Red Mist has just brought the world's first super-crime to an unsuspecting store owner...

IDETTE WINECOOR: PRODUCTION

DAVID BOGART: SVP OF BUSINESS AFFAIRS & TALENT MANAGEMENT

HIT-GIRL No. 3, November 2012. Published Monthly by Marvel Worldwide, Inc., a subsidiary of Marvel Entertainment, LLC. Office of Publication: 135 West 50th Street, New York, NY 10020. $2.99 per copy in the U.S. (GST #R127032852) in the direct market; Canadian Agreement #40668537. **Printed in the USA. Manufactured between 08/31/2012 and 09/11/2012 by R.R. DONNELLEY, INC., GLASGOW, KY, USA.**


ЧЫРВОНАЯ СМУГА:
Што?
ТАТА!
Супакойся, сіраціношка. Хутка ты з ім пабачышся.
Што за хрэнь з гэтай гарматай? Чаму яна не страляе?
Гэта ж XM-35, Крыс. Я казаў табе... Ёй трэба 30 секунд, каб перазарадзіцца.
Курвіска!


Трымай яго!
О божа! Бяжым!
TWO FAVORITES ISAT
Хлопцы, што вы робіце? Вы ж мае памагатыя!
А ну вярніцеся і змагайцеся!
CINDI
Мы ні за што не будзем біцца з азіятамі, чувак! Яны напэўна ведаюць кунг-фу ці штосьці яшчэ такое!
Калі ласка! Я дам вам па 5 тысяч кожнаму!
TWO FAVO
HOOD 2
Ты ашалеў? Паглядзі на іх!
Цяпер ты сам за сябе, Крыс.



BEANCO
UNG!
Якога ляда?
Ты ў парадку?
Т-так, усё ў парадку. Я проста...
Гэты хлопец толькі што застрэліў нашага тату!
Што?
Усё ў парадку! Я трымаю яго!
Адвалі ад мяне, прытырак!



WHUNGH!
Загладун!
Парні, стойце! Я магу патлумачыць! Гэта толькі непаразуменне!
Ах ты чортаў маркітун...
Што нам рабіць? Можа патэлефанаваць копам ці штосьці яшчэ?
Не турбуйся. Яны ўжо тут!


АЭРАПОРТ КЭНЭДЗІ:
Спадзяюся, ты разумееш, як лёгка выблытаўся, Крыс?
Калі б гэтыя копы не былі падкуплены тваім дзядзькай Ральфам, ты зараз быў бы ў турме. Ты ведаеш, які тэрмін бы ты атрымаў за забойства таго старыка?
А ў чым розніца? У любым выпадку ты высылаеш мяне назад, дзядзька Вік. Гэта нічым не лепш, чым патрапіць за краты.
Павер мне, малы. Ты бы і пяці хвілін не пратрымаўся ў Райкеры.
Таму твой дзядзька Ральф аказаў паслугу тваёй маці. Ён робіць гэта, бо любіць цябе і разумее, што ты праз многае прайшоў за апошні час.
Але ў горадзе становіцца небяспечна і яшчэ шмат перашкод паўстане на шляху Ральфа.
Я раблю ўсе, што ў маіх магчымасцях, каб усё спрасціць, але мы хвалюемся, што ты паранішся, калі акажашся ў цэнтры ўсяго гэтага.
Іншымі словамі, вы хочаце ўбраць мяне туды, дзе я не змагу нікому нашкодзіць.
Ну, гэта вельмі моцна сказана.


Курвіска! Ну чаму ніхто не ўспрымае мяне сур'езна? Які сэнс быць рок-зоркай, калі жывеш у вёске!? Чаму ніхто не хоча прызнаць мяне сапраўдным злачынцам?
Ведаеш, што я збіраюся зрабіць з усімі гэтымі грашамі? Я буду падарожнічаць па свеце, як Брус Уэйн і плаціць усім старадаўнім майстрам каб яны навучылі мяне баявым майстэрствам.
PASSPORT
DELTA
GOLD
JET BLUE
CHASE
AMERICAN EXPRESS
Я вывучу дзясятак моў, стану бліскучым навукоўцам, падкачаюся, і канешне набуду дупаву кучу розных прыкольных гаджэтаў.
Потым я вярнуся дадому і заб'ю супергерояў, якія забілі маяго бацьку. Мне да сракі, колькі на гэта спатрэбіцца часу. Яго смерць будзе адпомшчана і я, нарэшце, стану тым, кім ён заўсёды хацеў, каб я стаў.
Я вельмі рады гэта чуць, Крыс.
Не забывай наносіць крэм ад сонца, калі паедзеш у Азію. Там пячэ так, што вушы зварочваюцца.
І наразе. Мы замовілі табе вегетарыянскае меню ў самалёце. Твая мама сказала, што ты ня любіш грыбы, таму я заплаціў сцюардэсе 50 баксаў, каб яна іх выкалупала.
Дзякуй, дзядзька Вік.



Сакрэтны дзённік Забівашкі, узрост – 12 гадоў і 3 месяцы.
Сёння ВЯЛІКІ ДЗЕНЬ. Дзень, калі ўсё тое лайно, што я запланавала, стане рэальным і я заваюю павагу каралевы школьнага вулля.
Трэба ўсё пераправерыць, перш чым ісці на фронт. Я ж не хачу сустрэць гэтых ляпёх на аўтобусным прыпынку непадрыхтаванай.
90 хвілін на прычоску?
Гатова.
Нанясенне непрыстойна вялікай колькасці мамінага макіяжу?
Гатова.
Фарміраванне станоўчага меркавання наконт Селены Гомес?
Гатова.
Айфон, набіты дзесяцю тысячамі песен, аб якіх я да гэтага нават не чула?
Гатова.
Ты звязалася не з тым ПАДЛЕТКАМ, Дэбі Форман. Я РАСПЛЮШЧУ цябе сваім веданнем ГАЛОДНЫХ ГУЛЬНЯЎ. І даб'ю ведамі аб жыцці Бібера.
Няўжо Міндзі сёння зрабіла макіяж?
Яна толькі пачынае цікавіцца сабой, Маркус. Гэта добра. Гэта значыць, што яна нарэшце пачала спрабаваць уцягнуцца ў новае жыццё.


Лол! Няўжо наш тупы аўтобус яшчэ не прыйшоў? Можа нам усім варта забіць на школу і пайсці да мяне, нафарбаваць адзін аднаму пазногці ці яшчэ што-небудзь яшчэ.
STANDING
Ага, канешне. Выдатная ідэя.
Што здарылася са ўсім тваім новым адзеннем, Міндзі? Ты выглядаеш трохі па-іншаму.
А, ну я проста вырашыла трохі змяніць імідж. Ну, ты ведаеш, як гэта бывае, Дэбі. Часам цябе проста раз'юшвае ўсё, што вісіць у тваёй шафе і ты разумееш, што прыйшоў час выкінуць усё да сметніка.
Як вам мой новы бранзалет, які мне мама падарыла?
О, нічога сабе. Я проста абажаю танную пластыкавую хрэнь з H&M. Можна я пазучу яго на час? У мяне вечарына ў наступныя выхадныя.
Што?
Гата літаральна самае жаласнае гледзішча з тых, што я калі-небудзь бачыла.
Ты спрабуеш стаць падобнай на нас, шлёндра? Ты лічыш, што, як у амерыканскім кіно, ты, дзікунка, зменіш імідж і раптам станеш прынцэсай баля?
Мне шкада табе гэта казаць, але нават калі ты апранеш Juicy couture, усім будзе толькі цяжэй пады-маць вочы і глядзець на тваю велізарную пысу.
Ты не ператварышся ў чароўнага лебедзя, Міндзі. Ты ўсё тая ж брыдкая качка, якая набыла адзення на міліздрычны заробак свайго татулі-копа.
Божа! Да што з табой такое, Дэбі? Чаму табе заўсёды трэба быць такой похвай?



Ооо, якія мы словы ведаем. Глядзі не ўзарвіся ад напружання.
Адна ўжо хацела павесіцца на маім рамяні. Стаўлю на тое, што яна ў чацвер перарэжа сабе вены.
EX
ШКОЛА:
Добра, чаму б мне не пачаць з таго, што ўсе супергероі маюць фашысцкую паднаготную, а потым Марці пераб'е сваім фактам пра Гітлера?
EXIT
Якім яшчэ фактам пра Гітлера?
Тым, што ён забараніў амерыканскія коміксы, калі даведаўся, што большасць іх стваральнікаў - габрэі. Гэта на дзевятнаццатай старонцы, чувак. Ты наогул чытаў сцэнар?
Я ж казаў, што мы павінны забіць на супергерояў і паразмаўляць пра кошак: напрыклад, чаму дзікія кошкі не мяўкаюць, а хатнія гарлапаняць, як галодныя немаўляты.
Што тут за бабуйня тварыцца?



А? Ааа, мы з рабятамі запрошаны на Дзень нараджэння сястры Тода, і там будзе шмат дзяўчын.
Мы пішам сцэнар, аб чым мы будзем з імі размаўляць, каб не даць ім засумаваць і павялічыць нашыя шансы на клосцьва.
Добра. Я нават каментаваць гэта не буду.
Як там твая рука? Гатовы выйсці на чарговае паляванне на барыг сёння?
Не магу. Я з раніцы хадзіў на рэнтген, і доктар сказаў, што ўсё горш, чым ён думаў.
EXIT
Рука зламана ў трох розных месцах, і мне трэба адпачнуць месяца два.
Два месяцы? Гэта ж, халера, зламаная рука, Дэйв. Сарвігалава наогул сляпы, але ён жа неяк змагаецца са злачыннасцю.
Так, але гэта рэальнае жыццё, Міндзі. Гэтай рукой я пішу, і калі я не стану яе лячыць, тады могуць узнікнуць цяжкасці.
А што рабіць з калумбійцамі? Я лічыла, ты дапаможаш мне з маім пошукам підрыл?
Лічылася, што мы вывядзем з ладу грашовых кароў Джэнавезэ. Мы ўжо расправіліся з рускімі, сёння - калумбійцы, а ў нядзелю мы збіраліся высачаць Касіма Касільё!
Прабач, Міндзі, але я нічога не магу з гэтым зрабіць.


Мабыць, я магу як-небудзь ячшэ табе дапамагчы? Мабыць, я буду, як Аракул працаваць з кампутарамі некаторы час?
Забудзь. Я ўсё зраблю сама, калі ты не ўспрымаеш гэта сур'ёзна...
О божа. Паглядзіце на яе макіяж! Яна што, прапагандуе дзіцячую прастытуцыю ў школе?
Калі хто-небудзь з вас з ёй пачне размову - вы трупы. Зразумела?
Божа! Што гэта з ёй?
Без паняцця...
...але маё цярпенне скончылася.


ТУАЛЕТ ДЛЯ ДЗЯЎЧАТ:
Якога чорта? Ты глядзела на мяше ўвесь час, што я была на ўнітазе, лесбіянка?
«Прачніся, шлёндра».
«Давай жа. Не для таго я цягнула сюды тваю сраку, каб ты магла падрамаць».
Я-якога?..
Дзе-дзе я? Я...



SHIT!!
Лайно! Не адпушчай мяне!
Супакойся. Я трымаю цябе. Што ты там казала да таго, як я запардоліла цябе электрашокерам? Штосьці пра занадта шмат касметыкі?
Міндзі! Прашу! Проста адпусці мяне!
Прабач, Дэбі, але мы абедзве ведаем, што гэтага не будзе.
Ш-што?
Я падумала, што ўсім было б значна лягчэй, калі б цябе наогул не існавала.
Толькі не кажы, што я не давала табе шанс. Гэтага б не здарылася, калі б ты была хоць трохі дабрэй да астатніх!
Не! Прашу, малю цябе...


Нічога ня ведаю.
Аста ла віста, дурнуха!
KLYN
YCLE
TER
BROO KLYN


BZZZZ BZZZZ
Якога гака я ящчэ жывая?
Гэты грузавік з адкідамі праязжае тут кожны дзень у 16:27. Калі ты зноў будзеш паводзіць сябе як сука ў дачыненні да мяне ці іншых дзяцей у школе, тады я абяцаю: у наступны раз мы будзем тут трохі раней.
Усё зразумела?
Т-так.
Супер. У мяне на наступных выхадных плануецца піжамная вечарына. Мы з дзяўчынкамі збіраемся паглядзець які-небудзь фільм з Рыз Уізэрспун пра дзяўчынку, якая адмовілася ад жыцця ў горадзе, каб стаць спецыялістам па арганіцы на ферме.
Я запрашаю цябе і іншых дзяўчынак, таму не забудзьцеся пра свае піжамы.
Н-ні за што не прапушчу.
Я ж казала, што мы станем лепшымі сяброўкамі.



ДОМ МІНДЗІ:
Сонейка. Што здарылася?
Ты мяне падмануў, Маркус. Ты казаў, што яны вам не пагражаюць, але зірні, што мне толькі што даслалі. На іх напісана «Маме-мядзьведзянятке, тату-медзьведзянятку і малышцы-медзьведзянятцы»...
Daddy
О божа...
АДДЗЯЛЕННЕ ПАЛІЦЫІ:
Джыгантэ, мне трэба з табой пагаварыць.



Вось гэта настрой. Відаць, мяне чакае сур'зная размова.
Паглядзі, што мая жана знайшла ў паштовай скрыні гэтай раніцай.
POLICE EVIDENCE BAG
CASE NUMBER:
OFFICER:
Ну, я спадзяюся, што ты аддаў іх крыміналістам і зняў з іх адбіткі пальцаў.
Ужо. Яны чыстыя.
Ты ведаеш, як гэта яе падкасіла? Ведаеш, як доўга яна вясела на валаску, з-за гэтай гісторыі з Міндзі і яе бацькам?
Маркус, што я магу сказаць? Я так сама напужаны, як і ты.
Не шчыршы мне, Вік. Мы абодва ведаем, хто дае табе грошы на гэтыя шыкоўныя гарнітуры, і ты можаш асабіста перадаць яму, што пагрозы маёй сям'і не паўплываюць на расследванне.
Гэта падобна на абвінавачванне. Ня хочаш прадставіць мне яго ў пісьмовай форме?



Ідзі
ў похву.
GIGANTE
Не рабі глупстваў, Маркус. Тут і так адбываецца шмат лайна, дык яшчэ і цябе ў ролі Сцівена Сігала не хапала.
Сакрэтны дзённік Забівашкі, узрост 12 гадоў і 3 месяцы.
На гэты раз прыйшлося накачаць толькі маму. Маркус працуе ў падвойную змену, таму мне пашанцавала - мой запас Рафінола падыходзіў да канца.
Нататка: у наступны раз сцягнуць больш Рафінола. Я ж жыву каля ШПІТАЛЯ.
Леапольд «Лыжкавец» Урэна - дамініканскі пасрэднік Калумбійскага Картэля. Картэля, які звозіць у Нью-Ёрк менавіта столькі гераіна, колькі хоча гэты горад.
Але больш няма наркаманаў і брудных лыжак. Для Урэны гэта фабрыка – бізнэс і ён робіць БАГАЦЦЕ на сваіх маленькіх пяціграмовых пакуначках.


Закінутага будынка з новай сістэмай вентыляцыі ўжо дастаткова, каб ФАРАОНЫ заўважылі і паднялі ТРЫ - ВОГУ.
Але копы ня хочуць аб гэтым ведаць. Да таго часу, пакуль ПРАКЛЯТЫ ДЗЯДЗЬКА РАЛЬФ дае ім хабар.
Я планавала заблакіраваць усе выхады і падпаліць будынак, але я не чакала, што там працуе столькі ДЗЯЎЧЫН.
Некаторыя з іх не нашмат старэйшыя за МЯНЕ.
Гэй, Рудзі. Сходзі, набудзь нам яшчэ адну бутэльку.
Як скажаш, Лыжкавец.
Восем АБІЗГАЛАЎ-целаахоўнікаў. Усе ўзброеныя да трусоў.
Ну чаму ты прадынаміў мяне менавіта СЁННЯ, Мардабой?
Напзўна, больш разумна было б выйсці адсюль.
Знайсці дом насупраць і разабрацца з імі ўсімі маёй снайперкай, пакуль хто-небудзь...


Лайно!
Яны ж барыгі.
Канешне ж,
яны ня чысцяць
вентыляцыю.
Якога
чорта?


Не рухайся, маленькая шлёндра!
TO BE CONTINUED


NEXT

"Fantastic storytelling and stellar artwork make this an essential part of Millar and Romita Jr.'s *Kick-Ass* saga."

—Josh Wilding, *comicbookmovie.com*



Hit-Girl's To-Do List:

- ☑ Train protégé Kick-Ass.
- ☐ Take down mafia.
- ☐ Bust drug ring.
- ☑ Hide activities above from cop stepfather.
- ☐ Make friends with the Mean Girls at school.
- ☑ Get bloodstains out of new school clothes.
- ☐ Algebra.

The breakout star of *Kick-Ass* takes center stage in this limited series bridging the gap between *Kick-Ass* and *Kick-Ass 2*.

millarworld.tv
@mrmarkmillar

MILLARWORLD

MATURE CONTENT
$2.99US
DIRECT EDITION
MARVEL.COM
00311
7 59606 07822 6